РЭГІЁН
Гродзенская вобласць
№ 5
інфармацыйнае выданне
10 ліпеня 2008 г.

# ГРОДЗЕНСКАЯ ГЭС працуюць археолагі

***Спецыялісты Інстытута гісторыі НАН Беларусі, а таксама студэнты гістарычных факультэтаў Беларускага і Гродзенскага дзяржуніверсітэтаў пачалі чарговы этап археалагічных даследаванняў па берагах ракі Нёман у раёне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС.***


*на гэтым месцы каля в. Шчэчынава будзе пабудавана ГЭС*

Паводле загадчыка аддзела археалогіі першабытных грамадстваў Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім Лакіза, на гэтым, трэцім, этапе даследаванняў на месцы будаўніцтва ГЭС спецыялісты правядуць раскопкі на сямі пляцоўках па абодва бакі Нёмана.

"Дадзеныя археалагічных даследаванняў дапамогуць раскрыць новыя крыніцы вывучэння першабытнай гісторыі, - адзначыў Вадзім Лакіза. - Асабліва цікавымі абяцаюць быць раскопкі на пляцоўцы Кавальцы-4". Разам з тым ён падкрэсліў, што прагназаваць знаходкі складана.

"Напрыклад, у час красавіцкай камандзіроўкі мы выявілі на стаянцы Шчучынава паселішча эпохі мезаліту (8-7 тыс. гадоў да н.э.), аб якім не мелі ніякіх папярэдніх звестак", - расказаў загадчык аддзела.

У археалагічных даследаваннях таксама прымае ўдзел спецыяліст літоўскага Інстытута гісторыі. Раскопкі прадоўжацца да 6 жніўня.

***БЕЛТА***

## Княжаводцы : трагедыя, якую нельга забываць!

***20 ліпеня на месцы брацкай магілы каля в. Дубна адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы па ўшанаванню памяці беларусаў, якія былі знішчаны падчас карнай аперацыі нямецкіх войскаў у в. Княжаводцы.***


*помнік на брацкай магіле каля в. Княжаводцы*

Летам 1943 г. нямецкія войскі ацапілі населенны пункт з прылеглымі хутарамі. Карная аперацыя праводзілася дзеля помсты і прадухілення дзеянняў партызанаў, якія ўзарвалі чыгунку каля вёскі Княжаводцы.

Фашысты зганялі жыхароў у тры вялікія сараі: асобна жанчын і мужчын. Потым былі вырытыя катлаваны, каля якіх расстрэльвалі жыхароў. Некаторых фашысты расстралялі ў іх жа хатах, якія потым падпалілі. Некаторыя загінулі ад стрэлаў, калі спрабавалі ратавацца. З 1383 жыхароў загінула 922 чалавекі. Выратавацца ўдалося тым, хто паспеў схавацца або падманам зышоў з ацаплення.

***З. В.***

## ПЕРАТРУСЫ ЯК ПРЫКМЕТА ВЫБАРАЎ

8 ліпеня на кватэры пінскага актывіста дэмакратычных сіл Паўла Ляхновіча адбыўсяператрус. Як толькі Павал зьехаў на экскурсію, на ягоную кватэру прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным.

На Гродзеншчыне падчас мінулых прэзідэнскіх выбараў адбыўся шэрагператрусаў у грамадскіх і палітычных актывістаў Ваўкавыску, Шчучына, Мастоў і інш.

***З.В.***

**Памяці жыхароў вескі Княжаводцы, якія загінулі падчас фашыстоўскай карнай аперацыі ў 1943 г.**

## Пах бэзу

Цёплы травеньскі дзень,
Сонца ў небе блішчыць,
Патанаюць у кветках сады.
Я схавалася ў цень
Цішыню прасачыць,
Як прыгожа было ўсе тады!
Свежы водар ракі
Сярод пахаў другіх,
Што мне зычылі поле і лес,
А той водар, які
Быў прыемней за ўсіх,
Навакол распаўсюджваў бэз...
Бэз - здзівілася я -
Хоць займаў увесь абсяг,
А ў прыродзе не можа так быць:
Ад куста да куста
Невялікі прасцяг -
Акурат можна хату ўмясціць.
Паглядзела вакол,
Зразумела тады,
Чаму бэз незвычайна расце:
На гары абеліск
З той, Айчыннай войны,
На жалезным імёны лісце.
Немец злосны хадзіў,
Жаху волю даваў,
Перамогі не спраўдзіў надзей.
Жорстка хаты паліў,
Забіваў, катаваў
Ен бязвінных, няшчасных людзей.
Веску вынішчыў... хто
Перашкодзіць яму?
Толькі попелу кучы ляжаць.
А ці ведаў пра то
Гадоў 60 таму,
Што тут помнікі будуць стаяць?
Цёплы дзень над ракой,
Сонца ў небе блішчыць,
Патанаюць у кветках сады...
Над краінай спакой,
Спадзяюся пражыць
Я без гора, вайны і бяды.
Адыходзяць гады,
Тая купка бяроз,
Як раней на пагорку стаіць.
Ходзяць людзі сюды,
Колькі горкіх тут слез
Давялося камусьці праліць!
Бэз таксама расце.
Як маўклівы дакор,
Як жывы ўспамін яго пах!
Ен вясною цвіце,
Як на сэрцы ўзор,
І вайны нам нагадвае жах.

***Панцюхова Ксенія***

**РЭГІЁНЫ**

# Зэльва: фантаны замест дрэваў

***У сувязі са святкаваннем 750-годдзя горада, улады Зэльвы распачалі грандыёзную рэканструкцыю, падчас якой знішчаецца вялікая колькасьць дрэваў, асобныя віды якіх уяўляюць прыродную каштоўнасьць.***

У цэнтры горада знішчана некалькі дзесяткаў дрэваў, сярод якіх каштоўныя блакітныя елкі. Мясцовыя чыноўнікі адмаўляюцца каментаваць сітуацыю, а неабыякавыя жыхары горада збіраюцца звяртацца ў адміністрацыю прэзыдэнта з патрабаваннем спыніць пазазаконныя дзеянні уладаў, якія ў гарадскім парку на мейсцы спілаваных дрэваў плануюць пабудаваць некалькі фантанаў.

На думку жыхара Зэльвы Яўгена Скрабутана дадзеная рэканструкцыя не што іншае - як парушэнне заканадаўства і ігнараванне меркавання жыхароў горада:

-Неаднаразовыя звароты да мясцовых уладаў не далі ніякіх вынікаў, таму найбольш актыўныя грамадзяне прынялі рашэнне звяртацца ў адміністрацыю прэзыдэнта і пракуратуру з патрабаваннем спыніць знішчэнне дрэваў і пераўтварэнне цэнтра горада ў пустыню.

***Радыё Рацыя***

# Масты: плітка на месцы дрэваў

***За часамі Уладзіміра Вашко, старшыні Мастоўскага райвыканкаму, які кіраваў раёнам з 1973 да 1990 году, г. Масты быў адзін з самых “зялёных” местаў у Беларусі і лічыўся горадам узорнага парадку.***

Зараз грамадзяне заклапочаны змяншэннем зялёных насаджэнняў у горадзе. Цяпер у Мастах ідзе добраўпарадкаванне цэнтральных вуліц гораду і падчас добраўпарадкавання многія дрэвы знішчаюцца, аднак замест іх новыя не высаджваюцца. Медыкі звяртаюць увагу, што паветра ў горадзе значна забруджанае выкідамі аднаго з вядучых у Беларусі прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі ААТ “Мастоўдрэў”. Раней дрэвы хоць неяк ачышчалі паветра.

***З.В.***

# Самыя нізкія цэны на прадукты харчавання ў Шчучыне і Ашмянах

***Цэны на прадукты харчавання па рэгіёнах Беларусі досыць значна адрозніваюцца.***

Сярэдняя цана на ялавічыну першай катэгорыі на канец мая гэтага года склала 9102 рублі за кілаграм і вагалася ад 69808270 рублёў у Пінску, Оршы, Наваполацку, Лідзе да 926010.170 рублёў у Віцебску, Мінску, Магілёве, Бабруйску.

Як паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу, самыя нізкія цэны на свініну былі ў Верхнядзвінску, Ваўкавыску, Шчучыне, Клімавічах. Самыя высокія у Пінску, Наваполацку, Мінску, Беразіне, Бабруйску (990012.000 рублёў за 1 кг).

Увогуле самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты харчавання ў маі былі ў Верхнядзвінску, Шчучыне, Стоўбцах, Клімавічах, Ашмянах, а самыя высокія у Мінску, Магілёве, Бабруйску, Барысаве, Пінску.

***Аддзел статыстыкі РГВ***

# Правоохранительные органы Беларуси переквалифицируют «хулиганство» в теракт

***Не сегодня, так завтра правоохранительные органы Беларуси будут вынуждены отказаться от версии хулиганства во время праздничного концерта в Минске в ночь на 4 июля 2008 года. Такое мнение высказал(и) АФН источник(и) в правоохранительных органах Беларуси, ссылаясь уже на известные факты в ходе расследования инцидента, который собеседник иначе как теракт не квалифицирует.***

Сколько бы Александр Лукашенко ни повторял, что никакой «чрезвычайщины нет», вопросы которые он задавал сегодня на совещании, лишь подтверждают тот факт, что речь идет о самом настоящем теракте, целью которого не являлись многочисленные жертвы.

«Вы (Шейман госсекретарь Совета безопасности) ... не один год, а десять лет организуете подобные мероприятия. Вы и Глава Администрации (Невыглас): его политическая сторона, Ваша - безопасность. Ни черта не сделали!» - заявил А.Лукашенко. - «...Я реалист и понимаю: когда полмиллиона людей толпится на ограниченном пространстве, это сделать очень сложно. Но ведь случай произошел в тех местах, где, как мне докладывали, милиция, КГБ ползали по-пластунски, которые были взяты под особую охрану. Как же так произошло? Как же вы тогда охраняли?»

Но правильнее было спросить: «Что же произошло?».

Первое взрывное устройство а всего их было три было найдено сотрудниками правоохранительных органов между 22-30 и 23-00, то есть примерно на полтора часа до взрыва второго. Первая реакция это муляж, однако хватило благоразумия вызвать минеров (спецподразделение), которые, осмотрев муляж, признали, что речь идет о самом настоящем взрывном устройстве.

Следует отметить, что минеры прибыли на место теракта за полтора часа до взрыва, но найти второе и третье устройство им не удалось. Или не искали. Потом был взрыв, на место которого и отправился Лукашенко. «Полез в воронку», вернее добрался туда на бронированном джипе по специально организованному в толпе коридору.

Джип надежно защищал Лукашенко, у которого были на то политические мотивы, от возможного последующего взрыва, а воронка на то момент являлась самым безопасным местом на праздничной площадке сколько бы не было бы в этом месте взрывных устройств, они бы все сработали в результате взрыва.

Третье устройство нашли уже после того, как Лукашенко раздал указания по ликвидации последствий. Причем нашли опять же случайно, пнув ногой пакет из-под сока, который оказался слишком тяжелым. Сработать третье устройство должно было в 2 часа ночи.

Как сообщил источник, все три устройства были снабжены таймером и изготовлены на профессиональном уровне. Тол был расплавлен и залит вперемешку с гайками и подшипниками в пластиковые бутылки из-под пива и пакет из-под сока, что резко снижало возможность их обнаружения. Человек, который их изготавливал, хорошо понимал, что делает, что подтверждает «начинка» устройств. В Интернете уже неоднократно высказывалось мнение, что если бы организатор теракта преследовал цель получить как можно больше жертв, то для начинки он использовал бы обрезки гвоздей и саморезы.

Однако, как пояснил наш собеседник, использование такой начинки возможно лишь при условии использования при изготовлении двухслойного взрывного устройства, внутренняя часть которого заполняется толом (взрывным веществом), а внешний слой (рубашка) острыми предметами. Когда же гвозди и саморезы перемешиваются с толом, в момент взрыва они просто разрушаются в отличие от мелких шариков (подшипников) и гаек.

«Тот, кто изготавливал бомбы, хорошо об этом знал», - сказал собеседник.

Он также сообщил, что сегодня уже достоверно известно, что используемый в устройствах тол используется в современных боевых снарядах и не является «находкой» черных копателей, извлекающих оружие времен второй мировой войны.

***працяг на с. 4***

# Мастоўскі раён: патрабуюцца станцыі абезжалезвання вады

**Паводле афіцыйнага адказу ДзУ “Мастоўскі райЦГЭ” на дэпутацкі зварот Дзмітрыя Кухлея утрыманне жалеза ў вадзе цэнтралізаванага вадаправода ў кантрольных кропках в. Глядавічы перавышае нормы ў 2 - 4 разы, а па мутнасці амаль у 1,5 - 2 разы.**

Як сведчыць вопыт в. Лунна, дзе нядаўна рэспубліканскімі санэпідэміолагамі было выяўлена перавышэнне нормаў у дзесяткі разоў, нагледзячы на тое што мясцовыя спецыялісты казалі пра перавышэнне нормаў толькі ў 3- 5 разоў.

Пры гэтым якасць вады ў Глядавічах пагоршылася ў 2008 г. у параўнанні з 2007 г. У 2007 г. 40% узятых пробаў не адпавядалі СанПіН па павышанаму ўтрыманню жалеза, а ў 2008 г. ужо 57% пробаў.

***працяг на с. 4***

**АФІЦЫЙНА**



***будынак Мастоўскага суду***

10 ліпеня ў Мастоўскім раённым судзе разглядалася 2 адміністратыўных пратакола, складзенных на Мастоўскі РУП ЖКГ з-за адсутнасці сэртыфікатаў па якасці пітной вады ў в. Лунна. На момант складання матэрыялу рашэнне суду было не вядома.

***Ул. К.***

# Мастоўскі раён: патрабуюцца станцыі абезжалезвання вады

*Працяг. Пачатак на с. 3*

Згодна з адказам галоўнага доктара ДзУ "Мастоўскі райЦГЭ" А. М. Трачука на дэпутацкі зварот Дзмітрыя Кухлея, павышанае ўтрыманне жалеза ў вадзе з вадаправоду выклікана яго павышаным утрыманнем у падземных крыніцах артсвідравінах.

Працяглае ўжыванне пітной вады з высокім утрыманнем жалеза негатыўна ўплывае на здароўе чалавека: раздражняе слізістыя і скуру, выклікае гемахраматоз, алергію.

Гемахраматоз праяўляецца праз зніжэнне працаздольнасці, масы цела. Назапашвання жалеза ў печані вядзе да хранічнага запалення з трансфармацыяй у цыроз і адпаведнымі клінічнымі праявамі: павелічэннем печані, селязёнкі, пагаршэннем крыватоку, назапашваннем свабоднай вадкасці ў чэраўной паражніне (асцыт) з зыходам ў пячоначную недастатковасць. Параза суставаў характэрызуецца боллю, якая кепска паддаецца лячэнню. Адкладанне жалеза ў сэрцы можа быць прычынай парушэння сардэчнага рытму, развіццём сардэчнай недастатковасці (задышкі, пачашчанага сэрцабіцця, перыферычным ацёкам, часцей за ўсё ніжніх канечнасцяў). Параза падстраўнікавай залозы вядзе да развіцця цукровага дыябету (смагі, павелічэння мачавыпускання, падвышэннем глюкозы ў крыві), палавых залоз да атрафіі яечкаў з зніжэннем патэнцыі, зніккненнум другасных палавых прыкметаў і фемінізацыяй (у мужчын) і спыненню месячных, бясплоднасці жанчын. Назапашванне жалеза таксама негатыўна ўплывае на колер скуры.



Дзмітрый Кухлей

Падобная сітуацыя можа назірацца ва ўсіх сельскіх населеных пунктах Мастоўшчыны, дзе ёсць цэнтралізаваны вадаправод.

Дз. Кухлей плануе скарыстацца вопытам дэпутата Луннеская сельсавета А. Пудаўкіна і распаўсюдзіць яго на іншыя населенныя пункты Мастоўшчыны. У Лунна намаганнямі А. Пудаўкіна атрымалася дамагчыся збудавання станцыі абезжалезвання, на што з бюджэту ўжо ў гэтым годзе будзе выдаткавана 95 млн. руб.

**З.В.**

# Правоохранительные органы Беларуси переквалифицируют «хулиганство» в теракт

*Продолжение. Начало на с.3*

По словам собеседника, около месяца назад КГБ Беларуси задержало бывших сотрудников «Алмаза» (спецподразделение МВД), у которых также был изъято взрывное вещество, применяемое в современных снарядах. Он сообщил, что по этому поводу возбуждено уголовное дело, однако не стал увязывать бывших алмазовцев с произошедшим терактом.

Но самое печальное, по мнению источника, заключается в том, что сегодня ни КГБ, ни остальные правоохранительные органы не имеют понятия, в каком направлении начинать расследование этого дела. В качестве примера прозвучали отдельные меры, предпринимаемые КГБ. Так сотрудники ведомства обзванивают всех выпускников технических вузов страны, которые хоть как-то сталкивались во время обучения с взрывным делом. Также, по некой непонятной причине КГБ намерено обратиться к украинским коллегам с просьбой о предоставлении максимальной информации о расположенных в Западной Украине лагерях по подготовке «боевиков».

Сегодня также не секрет, что уже 4-го июля руководство КГБ начало искать всех бывших сотрудников ведомства, чтобы просто набраться у них хоть какого-то опыта и знаний. Впрочем, в этом нет ничего удивительного, ведь состояние, в котором сегодня пребывает руководство КГБ и не только, собеседник охарактеризовал, мягко выражаясь, как стопор.

***Агенство финансовых новостей***

**РЭГІЁН**
**Гродзенская Вобласць**
інфармацыйнае выданне
№ 5, 10 ліпеня 2008 г.

Надрукавана ў друкарні ААТ "Смоленская печать", г. Смоленск, ул. Ломоносова, 3.
Выходзіць 1 раз на месяц.
**Распаўсюджваецца бясплатна.**

**Адказны рэдактар: Зміцер Васілеўскі.**
Наклад: 299 асобнікаў.
Адрас рэдакцыі: г. Гродна,вул.Савецкая 35/3.
Беларусь.
e-mail: rehijon@gmail.com